М. У. Васілёнак

# ГІСТОРЫЯ СТВАРЭННЯ ГЕТА Ў Г. МІНСКУ Ў ЧАС ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

*Разглядаюцца абставіны стварэння яўрэйскага гета ў г. Мінску падчас Вялікай Айчыннай вайны.*

Падчас Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў нацысцкая Германія праводзіла ў адносінах да яўрэяў палітыку генацыду, называючы яе "канчатковым вырашэннем яўрэйскага пытання". У адпаведнасці з гэтай палітыкай кожны яўрэй, незалежна ад полу, узросту, грамадскага становішча быў безумоўна асуджаны на вынішчэнне. Яўрэйскі народ быў адзіным народам планеты, які павінен быў цалкам знікнуць з твару Зямлі. Такая палітыка праводзілася і на акупаванай тэрыторыі СССР. Праблема вынішчэння яўрэяў па-ранейшаму прыцягвае увагу даследчыкаў, нягледзячы на актывізацыю яе вывучэння пасля атрымання Рэспублікай Беларусь дзяржаўнага суверэнітэту. У сувязі з гэтым нельга абыйсці ўвагай гісторыю стварэння гета ў г. Мінску, якое стала адным з самый буйных месцаў знішчэння яўрэйскага насельніцтва як з Беларусі і іншых рэспублік СССР, так і з шэрагу еўрапейскіх краін. Праіснавала яно з 19 – 20 ліпеня 1941 г. да 21 – 23 кастрычніка 1943 г. За гады вайны ў Мінскім гета былі заняволены больш за 100 тысяч яўрэяў. На акупаванай тэрыторыі СССР яно было другім па колькасці заняволеных пасля Львовскага гета (136 тысяч вязняў). Выратавацца з Мінскага гета ўдалося толькі 2 – 3% былых ахвяр. Ужо 1 ліпеня 1941 г., на трэці дзень пасля захопу горада, акупанты аб'явілі аб накладанні на яўрэйскае насельніцтва г. Мінска "кантрыбуцыі". Усе яўрэі павінны былі здаць пэўную колькасць грошай, золата і срэбра. За невыкананне тэтага загада (як і за невыкананне іншых) – растрэл. Пасля гэтага было загадана стварыць яўрэйскі камітэт (юдэнрат), старшынёй якога быў прызачаны І. Мушкін. Згодна з архіўнымі дадзенымі і інфармацыяй сведкаў, у гады Вялікай Айчыннай вайны ў г. Мінску было тры гета: 1. "Вялікае" гета – праіснавала са жніўня 1941 г. да 21 – 23 кастрычніка 1943 г. Яго тэрыторыя ахоплівала 39 вуліц і завулкаў вакол Юбілейнай плошчы – у раёне яўрэйскіх могілак і Ніжняга рынку. Вуліца Рэспубліканская (падчас акупацыі – Міттэльштрассэ, зараз – Раманаўская Слабада) пераразала гета наскрозь, з абодвух бакоў была адгароджана ад гета калючым дротам і выкарыстоўвалася як праезджая частка для звычайнага транспарту. Сюды было сагнана больш за 80 тысяч яўрэяў. Уся тэрыторыя гета была агароджана калючым дротам. Уваход і выхад з гэтага раёна быў дазволены толькі па вуліцах Апанскага (зараз – Кальварыйская) і Астроўскага (зараз – Ракаўская) звычайна ў складзе рабочай калоны, ці па дазволу прадстаўніка нямецкага камандавання. Пералазіць праз агароджу было забаронена. Парушальнікаў звычайна расстрэльвалі. 2. "Малое" гета – знаходзілася ў раёне радыёзавода ім. Молатава (зараз – завод ім. Леніна) з кастрычніка 1943 г. да 30 чэрвеня 1944 г. 3. "Зондэргета" (частка гета па вуліцах Сухой і Абутковай) – гета для 20 тысяч яўрэяў, вывезеных нацыстамі з 7 краін Еўропы. Праіснавала з лістапада 1941 г. да верасня 1943 г. Акупантамі ў гета былі створаны невыносныя ўмовы жыцця. На кожнага чалавека вызначалася па 1 – 1,5 квадратныя метры жыллёвай плошчы. Людзі галадалі, бо акупанты кармілі толькі тых, хто працаваў. Такім выдавалі па 200 грамаў хлеба з дамешкамі апілак і міску баланды. Электраэнергія адсутнічала. Вадапровод прамярзаў зімой і для прагатавання ежы выкарыстоўвалі снег. Гэта вяло да росту інфекцыйных захворванняў сярод вязняў гета. Дзеці вязняў не маглі вучыцца. Адзіночныя забойствы, пагромы, аблавы сталі звычайнай практыкай. Сваімі дзеяннямі акупанты імкнуліся знішчыць яўрэйскае насельніцтва не толькі фізічна, але і прынізіць маральна. Для маёй сям'і Мінская гета – незагойная рана. Там загінулі многія мае сваякі. Але адзін застаўся ў жывых. Дзякуючы яму я і вялікая колькасць людзей можам даведацца пра вялікія жахі, якія адбываліся там. Пра разарваных папалам дзяцей, пра немаўлят, чые галовы разбілі аб сцены, пра цяжарных жанчын з нажамі, уваткнутымі ў жывот. Пра забойства тысяч мужчын, жанчын і дзяцей толькі за тое, што яны – яўрэі. Мая задача – не даць людзям забыць пра трагедыю яўрэйскага народа.

### *Список литературы*

1. Рубинштейн, Л.М. "Нельзя забыть..."/ Л.М. Рубинштейн. – Минск: Медисонт, 2012. – С. 34 – 35, 45.

*Васелёнок Мария Владимировна,* студентка Белорусского государственного университета информатики и радиоэлектроники, owliss@mail.ru
*Научный руководитель: Николаева Людмила Викторовна,* доцент кафедры гуманитарных дисциплин Белорусского государственного университета информатики и радиоэлектроники, кандидат гуманитарных наук, Mikalayeva@bsuir.by .



Библиотека БГУИР